**20.** Які адпаведнік у беларускай мове мае дзеяслоў з рускай мовы *обагрить*?

**А)** абагрэць. **Б)** абадраць. **В)** пачырваніць.
**Г)** абвінуць. **Д)** абганяць.

**21.** Вызначце з дадзеных сказ(-ы), у якім(-іх) *не(ня)* са словамі трэба пісаць разам:

*1) (Не)хта прынёс незвычайны камень.*
*2) Страчанага назад (не)вернеш.*
*3) (Не)льга пераходзіць дарогу на чырвоны свет.*

**А)** усе сказы. **Б)** няма правільнага варыянта. **В)** 1, 2.
**Г)** 2. **Д)** 1, 3.

**22.** Які адпаведнік у беларускай мове мае ўстойлівае спалучэнне з рускай мовы *ищи ветра в поле*?

**А)** прапаў як цень на вадзе. **Б)** прапаў як туман.
**В)** спусціцца з гары. **Г)** хуткі на хаду.
**Д)** як вадой разліўся.

**23.** С*уп з ячных круп* у народзе здаўна называюць … .

**А)** гушча. **Б)** поліўка. **В)** лёк. **Г)** булён. **Д)** панцак.

**24.** Усім вядомы з маленства літаратурныя героі:
*1) Тубі; 2) Карлсан; 3) Мышка Пік-Пік; 4) Бураціна; 5) Айвенга.*
У творах пісьменнікаў з якіх краін яны з'явіліся? Знайдзіце правільныя варыянты:

*а) Беларусь; б) Данія; в) Англія; г) Швецыя; д) Італія.*

**А)** 1-д, 2-в, 3-б, 4-г, 5-а. **Б)** 1-б, 2-а, 3-д, 4-г, 5-г.
**В)** 1-в, 2-б, 3-б, 4-а, 5-д. **Г)** 1-а, 2-г, 3-а, 4-д, 5-в.
**Д)** 1-г, 2-а, 3-в, 4-б, 5-д.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3–218
тэл. (017) 292 80 31, 290 01 53
e-mail: info@bakonkurs.by
http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 9. Тыраж 26800 экз. г. Мінск. 2012 г.

Конкурс па беларускай мове
## «БУСЛІК-2012»

*Чацвер, 16 лютага 2012 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 120;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/.

---

## Заданне для вучняў 3-4 класаў

**1.** Разгадайце загадку: *ніколі шапкі не здымае, бо ні адной рукі не мае.*

**А)** рухавік. **Б)** кран. **В)** дом. **Г)** грыб. **Д)** парасон.

**2.** Якой часцінай мовы з'яўляецца выдзеленае ў дадзеным сказе слова?
*Сябры любілі назіраць у полі за* ***рознымі*** *матылькамі, жучкамі.*

**А)** назоўнікам. **Б)** прыметнікам. **В)** дзеясловам.
**Г)** прыслоўем. **Д)** займеннікам.

**3.** Дапоўніце народны выраз: *загадка – розуму … .*

**А)** падказка. **Б)** разгадка. **В)** зарадка. **Г)** знаходка. **Д)** прыбытак.

**4.** Якое значэнне мае ўстойлівае спалучэнне *шыта белымі ніткамі*?

**А)** у пастаянных занятках, клопатах. **Б)** драмаць седзячы.
**В)** неспадзявана, нечакана. **Г)** перавага над іншымі.
**Д)** няўмела зроблена.

**5.** *Самаробны кубак для піцця вады* ў народзе яшчэ называюць … .

**А)** міска. **Б)** слоік. **В)** цэбар. **Г)** кубел. **Д)** карэц.

**6.** Якой назвы народнага свята не хапае ў вершаваных радках Уладзіміра Дубоўкі?

*Ёсць цудоўнае паданне,*
*як на свята, на …,*
*ад паўночы да світання*
*кветку Шчасця ў нас шукалі.*

**А)** Каляды. **Б)** Гуканне Вясны. **В)** Купалле.
**Г)** Узвіжанне. **Д)** Тройцу.

**7.** У літаратурным творы *сродкам стварэння вобразаў* з’яўляецца ... .
**А)** гук. **Б)** слова. **В)** сцэнарый. **Г)** мелодыя. **Д)** фарба.

**8.** Якое дрэва ў народных паданнях называлася “*нячыстым*”?
**А)** сасна. **Б)** бяроза. **В)** таполя. **Г)** асіна. **Д)** вярба.

**9.** Дадзены словы:
*1) залівачны; 2) залівісты; 3) заліўны.*
Якое слова мае значэнне *‘які затапляецца ў паводку вадой’*?
**А)** няма правільнага варыянта. **Б)** усе прыметнікі.
**В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**10.** Выберыце з прыведзеных правільна напісаныя словы:
*1) пяшчаны; 2) солнечны; 3) дверы; 4) казьба.*
**А)** усе словы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3.
**Г)** 1, 4. **Д)** 2, 3.

**11.** Як называюцца ўсе склоны, акрамя назоўнага?
**А)** прамыя. **Б)** ускосныя. **В)** паралельныя.
**Г)** іншыя. **Д)** другарадныя.

**12.** Любую *кнігу* можна … .
**А)** адчыніць. **Б)** разгарнуць. **В)** расплюшчыць.
**Г)** распачаць. **Д)** адкаркаваць.

**13.** *Даўняя мера зямельнай плошчы* называлася … .
**А)** аршын. **Б)** асьміна. **В)** вярста. **Г)** валока. **Д)** капа.

**14.** Закончыце прыказку: *не сунь носа ў … .*
**А)** чужое жыта. **Б)** чужое проса. **В)** чужое зерне.
**Г)** чужы гарох. **Д)** чужыя арэхі.

**15.** Колькі назоўнікаў у форме адзіночнага ліку ўжыта ў вершаваных радках А. Грачанікава?

*Мова…*
*Родная мова.*
*У марах, песнях, снах.*
*Мае ў ёй кожнае слова*
*Свой колер, і смак, і пах.*
*Зліваюцца гукі ў словы*
*І ў рэчышча роднай мовы,*
*Як рэкі ў мора цякуць.*

**А)** 7. **Б)** 8. **В)** 9. **Г)** 10. **Д)** 11.

**16.** Дадзены словы:
*1) тэлеграма; 2) тэлефон; 3) гардэроб; 4) ордэн.*
Колькі разоў ва ўсіх словах паўтараецца [э]?
**А)** 3. **Б)** 4. **В)** 5. **Г)** 6. **Д)** 7.

**17.** Якія з прапанаваных слоў маюць аднолькавую колькасць гукаў?
*1) цукерка; 2) вяселле; 3) верасень; 4) бавоўна.*
**А)** 1, 2. **Б)** 2, 3 **В)** 3, 4. **Г)** 1, 3, 4. **Д)** 2, 4.

**18.** Колькі назваў гарадоў у вершаваных радках Петруся Броўкі?

*Мая Айчына – поле, нівы,*
*Над Нёманам зялёны гай,*
*Прыгожы Брэст і Мінск шумлівы –*
*Уся Беларусь, ад краю ў край.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**19.** У некаторых мясцовасцях ужываюць у размове слова *цапстрыкі.* Якое значэнне яно мае?
**А)** рабіць штосьці спехам, абы-як.
**Б)** дробныя рэчы хатняга скарбу.
**В)** субяседнікі, якія добра ведаюць адзін аднаго.
**Г)** штодзённыя турботы.
**Д)** неразгаданыя тайны.